Opłatę pocztową
uiszczono ryczałtem

Цана асобнага нумару 20 грошаў.

НАРОДНАЯ СПРАВА

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6. (Wileńska 12, m. 6). Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адраса 30 гр	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№. 34 Вільня, Субота, 13-га лістапада 1926 г. Год I

Прывітаньне братом!

Дваццаць гадоў назад, калі ў Вільні—адвечнай сталіцы нашага краю — закладалася кузьня беларускае палітычнае мысьлі і літэратурнага творства, — усім здавалася, што адвечная гістарычная роля сівой Вільні ў жыцьці Беларускага краю ўзнавілася, што ў мурох яе ізноў творыцца цэнтр нашае культурнае працы, што згэтуль засеўшы кіраўнічая думка адраджэнскага руху будзе лунаць над усенькай Беларусяй.

Так яно і было блізу да апошніх год. Але якраз апошнія гады, абярнуўшы Вільню з сталіцы вялікае краіны ў „крэсавае" ваяводзкае места, пазбаўлене шырэйшае падставы ў краю,—судзілі ёй другую долю. Пануючая польская буржуазія прыдушыла ўсе беларускія праявы ў Вільні, зрабіла нашу творчую культурную працу тут блізу зусім немагчымай, ды штучна створанымі польскімі нацыянальнымі ўстановамі надала ёй „чыста польскі" характар, які і дэманструе пры кожнай нагодзе розным чужаземным госьцям... І толькі з самых „нізоў народных — спасярод работніцкіх масаў Вільні, па крыві і паходжаньні зьвязаных неразважна з беларускай вёскай, — пачалі адрастаць новыя расткі беларушчыны, сулячы тут нашай справе *перамогу ў будучыні, калі воля працоўных будзе панаваць на нашай зямлі.*

Аднак-жа, сяньня беларускія культурныя ўстановы ў Вільні ледзьве дыхаюць, а добрая палова інтэлігентных сілаў аказалася прымушанай эміграваць на Усход, няма моцы ў нас прылажэньня для сваей веды і энэргіі. І культурная кузьня, цэнтр тварэньня беларускае навукі — *перайшлі на Усход, у Менск.*

Там стварыўся запраўды-ж адпаведны грунт дзеля каваньня нашых культурных цэннасьцяў: дзякуючы таму, што ўлада ў Усходняй Беларусі апынулася ў руках работнікаў і сялян, — працоўныя масы атрымалі магчымасьць разьвіваць без перашкодаў сваю нацыянальную культуру, а ўласная дзяржаўнасьць дала ўсей гэтай працы фінансавыя падставы, пазволіла прыцягнуць да работы ўсе жывыя беларускія інтэлігенцкія сілы. І вось у Менску, які некалі быў як-быццам „на загуменьні беларускага руху", творыцца вышэйшая беларуская школа—ўнівэрсытэт, творыцца і найвышэйшая навуковая ўстанова — зачатак беларускае Акадэміі Навук—так-званы *Інбелкульт* (Інстытут Беларускае Культуры)

У гэту нядзелю, 14 лістапада, *Інбелкульт* склікае першую ўсебеларускую навуковую канфэрэнцыю, каб аб'яднанымі сіламі ўсіх беларускіх вучоных і культурных дзеячоў вырашыць найболш пільныя пытаньні беларускага правапісу і беларускае азбукі. На канфэрэнцыю запрошаны беларусы з усіх частак СССР, з-пад Польшчы, Латвіі і Літвы, а таксама прадстаўнікі заграніччнае эміграцыі. Беларуская навука пераступіла праз усе тыя палітычныя межы, якімі парэзана Беларусь. Бо па-над гранічнымі канцамі лунае адзіная беларуская навуковая думка, бо беларускія культурныя працаўнікі, якія, незалежна ад таго, куды закінула іх доля, асталіся вернымі інтарэсам свайго многапакутнага працоўнага люду, усюды аднолькава твораць культурныя фундамэнты для колішняе сьветлае будучыні яго.

На вялікі жаль, беларусы з-пад Польшчы аказаліся блізу зусім пазбаўленымі магчымасьці прыняць удзел ў менскім культурным зьезьдзе. Супраць адзінства беларускага народу, супраць няўхільнае патрэбы аб'яднаньня творчых высілкаў працаўнікоў на ніве культуры і навукі наабапал гранічнае мяжы—выступілі палітычныя, ці—правільней — паліцэйскія мяркаваньні польскае адміністрацыі.. І тым, што ў працягу дзесяткоў лет бязупынна аддавалі свае сілы будаваньню беларускае культуры, пазбаўлены магчымасьці сказаць аб ёй сваё слова цяпер, калі іх думкі-лятуценьні рэалізуюцца!

Аднак, вольнае думкі ніякая сіла, ніякая ўлада зьвязаць ня ў сілах. І мы сяньня ў мысьлі злучаемся з нашымі зарубежнымі братамі і шлем ім—хаця праз газэту—наш гарачы прывет і шчырае пажаданьне плоднае працы дзеля „карысьці паспалітае".

Водгукі дэкрэту проці прэсы.

Сярод працаўнікоў прэсы заграніцнай— дэкрэт п. Прэзыдэнта выклікаў страшэннае ўзварушэньне. Зараз жа пасьля апублікаваньня дэкрэту пачаліся ў Варшаве нарады саюзу варшаўскіх журналістаў, Сувязі саюзаў усіх польскіх журналістаў, Саюзу парляманцкіх справаздаўцаў, Саюзаў заграніцчных карэспандэнтаў у Варшаве і інш. аб тым, як рэагаваць на гэты паход проці прэсы ў Польшчы.

Уся аб'яднаная і арганізаваня прафэсіянальна прэса ў Польшчы маніцца распачаць супольную акцыю ў мэтах абароны самога істнаваньня прэсы ў краі, якому новы дэкрэт пагражае вельмі паважна, падрэзываючы як матарыяльна, таксама і духова.

10 лістапада мела адбыцца ў Варшаве вялікае сабраньне журналістаў—з учасьцем усіх рэдактароў, выдаваных у сталіцы часопісаў. Вестак аб яго пастановах пакуль што яшчэ няма.

„Правыя фашысты" страшэнна ўзбураны дэкрэтам, які выданы „левымі", каб „закелзаць" прэсу апазіцыі...

„Польская прэса ў часе свайго істнаваньня шмат чаго перажыла: — яе душыла цэнзура чужынцаў-заборцаў: расейцаў, немцаў, аўстрыякаў; яна пратрывала цяжкія часы розных акупацыяў. Але так далёка сягаючых рэпрэсіяў, якімі пагражае апошняе распараджэньне п. Прэзыдэнта, гісторыя польскай прэсы дагэтуль ня ведала...—З дэкрэту відаць ясна, што ідзе ня толькі аб барацьбу з надужыцьцямі свабоды слова, але папросту — аб барацьбу з прэсай, ясна-ж — з прэсай апазіцыйнай". Правая газэта, з якой бяром гэтыя радкі, кажа, што даволі аднаго „добрага штрафу" ў 10.000 злотых, каб разваліць амаль ня кожную з драбнейшых газэт у Польшчы... „Дык гэта-ж—вельмі лёгкі спосаб зьніштажэньня прэсы, якая піша нямілыя для сучасных паноў палажэньня рэчы"..

Нажаль, даўнейшыя паны палажэньня— паны Кернікі — не здалелі таго ж зрабіць у сваім часе з сваей апазіцыяй!

Што ў дэкрэце фактычна ідзе галоўным чынам якраз аб гэтых „сучасных паноў палажэньня", гэта-ж ясна зусім,—хаця б з таго, што судзіць ды караць у сваей уласнай справе будзе сам урад, сам „сучасны пан палажэньня", але ня суд, які, прынамся ў тэорыі, стаіць, ці павінен стаяць — „па-за ці па-над партыямі"... „Незалежнасьць судоў (хаця яе пакуль-што неяк блізу няма...) дае гарантыю поўнай бесстароннасьці і справядлівасьці; публічны (пры зачыненых дзьверах, як гэта амаль не ўвайшло ў правіла ў нас цяпер?!) судовы працэс дае магчымасьць даказываць праўду ды бараніцца проці няслушных абвінавачаньняў"... Дык жа дэкрэт аддае ўсю справу прыгаварываньня і выкананьня прысуду—у рукі тых самых „прадстаўнікоў улады", якія пачуліся пакрыўджанымі крытыкай іх дзеяльнасьці ці асобы ў прэсе... Сам „пан улада" мае быць цяпер пракурорам, старшынёй суда, судзьдзёй, сьведкам ды каморнікам (судовым приставам) — у сваей уласнай справе...

Гэткім шляхам мае ў Польшчы адбыцца так-званае „маральнае адраджэньне" яе панаваньня законнасьці, звычаяў і дзяржаўнага ладу, якое паставіў на чаргу палітычнага дня „маёвы пераварот", зроблены марш. Пілсудскім...

Новы дэкрэт яўна ўводзіць прынцып „урадавага самасуду", прынцып неабмяжаванай адміністрацыйнай самаволі—адносна да прэсы, не даючы ёй ніякае магчымасьці абароны... Новы прэсавы закон фактычна і „праўна" будзе зусім забіваць усялякую апазіцыйную прэсу ў краі, пакідаючы свабоду толькі прэсе ўрадавай ці „бутэрброднай"...ж Але ж гэта, апрача агульнай дэмаралізацыі прэсы ў краі, якраз забʼе ўсю запраўдную карысную ролю прэсы ў дзяржаве: прэса пачне толькі казаць салодкія камплімэнты, рэчы прыемныя для паноў „прадстаўнікоў улады", але будзе маўчаць аб тым зьле, якое, можа, будзе тварыцца Польскай Дзяржаве гэтымі „неабмыльнымі" валадарамі, — аб тых небясьпеках, якія пагражацімуць можа самаму істнаваньню дзяржавы... Бо ж дэкрэт якраз і кажа аб тым, каб—„ня выклікаць трывогі ў грамадзянстве".

Новы дэкрэт паказуе, што „манархізацыя Польшчы" ідзе шпаркім ходам, бо-ж толькі з гэтага пункту гледжаньня і можна вытлумачыць дэкрэт проці „дерзости" абмяжаваных розумам падданых, якая „асьмеліваецца" крытыкаваць пастаўленых „Вышэйшай уладай" урадоўцаў.. Ясна, што іменна з гэткага пункту гледжаньня „неабмыльным ды нятыкальным" зьяўляецца кожны дробны ўрадовец, ня кажучы ўжо аб панах паліцыянтах, якія „робяць распараджэньні..." і іншыя „чыннасьці"... Кожная „зьнявага", кожнае недаверые да іх — гэта яўная непашана для тэй „Вярхоўнай улады", якая іх паставіла... Бо ж адна толькі гэтая фактычная (пакуль-што!) „Вярхоўная ўлада" ведае, што яна робіць, ды — што трэба рабіць... Адна толькі яна ведае, скуль, як і калі ідзе якая пагроза дзяржаве... Рэшта „падданых", якія пакуль-што яшчэ з ветлівасьці называюцца „грамадзянамі", павінна толькі—„слухаць ды спаўняць", як вучылі калісьці ў жаўнерскай „славеснасьці" ў „добрыя" старыя царскія часы—маладых навабранцаў...

Таксама акурат вучыў і нас усіх у Вільні „ідэйны павадыр польскіх радыкалаў пілсудчыкаў"—слаўны польскі пісьменьнік, „закляты вораг расейскага царызму" — пан Серошэўскі...

Недарма-ж адна палова дэкрэту ўзята з даўнейшага „выняткowага законадаўства" царскіх часоў, а другая — з „найнавейшага" фашыстаўскага, які адбудоўвае тое „самадзяржаўе", аб якім ужо штосьці каля сталецьця як зусім забылася Заходняя Эўропа...

Чытаючы пастановы дэкрэту аб карах на прэсу за „зьневажаньне" прадстаўнікоў улады ў Польшчы, мімаволі прыходзе на памяць арт. 2 Статуту Вялікага Князьства Літоўскага, выданага ў 1588 годзе каралём Жыгімонтам III, у якім дасловна сказана (пабеларуску):

„Мы, гаспадар, шлюбуем нікога не караці на заочнае паведаньне, хаця-бы датыкалася маестату нашага гаспадарскага абражэньня"...

Гэта было... 338 гадоў назад. А цяпер?! —Ідзем усё наперад!..

Сойм і Сэнат.

Да адкрыцьця сэсіі.

Прэм'ер Пілсудскі выслаў да старшыняў Сойму і Сэнату пісьмы, у якіх, далучаючы дэкрэт аб адчыненьні Сойму і Сэнату 13 лістапада, просіць паведаміць аб гэтым паслоў і сэнатараў, каб прынялі ўчасьце ў урачыстасьці..

Дэкрэт, які мае з такой нябывалай у Польшчы ўрачыстасьцю прачытаць паслам і сэнатарам п. Прэзыдэнт, зьмяшчае ўсяго некалькі слоў:

„На падставе арт. 25 і 35 Канстытуцыі, адчыненьне звычайнай сэсіі Сойму і Сэнату, скліканых маім дэкрэтам 31 кастрычніка, назначаю ў Замку 13 лістапада ў 2 гадз. дня".

Гэткім чынам адчыненьне парляманту аканчальна—мае быць ня ў Сойме, але ў палацу, дзе жыве п. Прэзыдэнт.

Гэткім чынам у Варшаве сярод пралетарыяту камуністы ўжо выбілі пэпэсаў з іх манапольнай дагэтуль пазыцыі. Палітыка пэпэсаў робіць сваё...

У Польшчы.

Рэзультаты выбараў у варшаўскую Касу Хворых.

Выбары ў варшаўскую Касу Хворых далі вельмі цікаўныя рэзультаты.

З усіх працаўнікоў, маючых права голасу, галасавала толькі 25 працэнтаў, або—адна чверць.

На першым мейсцы — па ліку выбраных кандыдатаў—стаяць камуністы, якія атрымалі 21 мандат; пасьля ідуць пэпэсы, атрымаўшыя 16 мейсцаў; пасьля Бунд—4 мандаты, драбнейшыя сацыял. фракцыі — яшчэ менш.

„Польскія работнікі-нацыяналісты" (НПР) атрымалі ўсяго 1 мандат. Хадэкі набралі галасоў на 11 мейсц. Умысловыя працаўнікі здабылі 5 мейсц.

Ізноў галадоўка палітычных вязьняў у Беластоцкім вастрозе.

„Роботнік" паведамляе:

„У Беластоку ўжо 3 дні, як ідзе галадоўка палітычных вязьняў. Галадоўка абʼяўлена, як пратэст проці біцьця ды ганяньня ў кайданах палітычных на дапросы. „Ня гледзячы на дамаганьні вязьняў, пракурор ня прыбыў да вастрогу, каб выслухаць скаргі іх. Трэбуем умяшацельства міністра справядлівасьці ў гэтую справу"...

Мы таксама трэбуем... Толькі адначасна дзівімся, чаму пэпэсы, „трэбуючы ўмяшацельства" ад пана Мэйштовіча, нічога-нічагусенькі ня трэбуюць ад свайго ўласнага міністра—„тав. Морачэвскага"?!.

Узрост цэн у Варшаве.

Газэты пішуць, што ў Варшаве пачаўся шпаркі ўзрост цэн на прадметы першай патрэбы, як: хлеб, масла, мяса і інш.

Далейшыя „гаспадарчыя вынікі Нясьвіжа"...

„Дзен. Віл." падае вестку з Варшавы, што перагаворы ўраду з цукраварамі-абшарнікамі ідуць добра.. для абшарнікаў! Аб сьмеласьці і велічыні апэтытаў цукравараў сьведчыць тое, што яны дамагаюцца падвышкі не на 25 прац., як мы паведамлялі са слоў польскіх газэт, але аж на 50 прац., ці ў паўтара разы! Гэткім чынам кілё цукру мела-б каштаваць ня 1 зл. 40 гр., як цяпер, але—больш як 2 злоты..,

І цяпер польскі цукер заграніцай значна танейшы, як у Польшчы, а пасьля дык сялянам нават „у прыглядку" ня піць гарбаты ні кавы з цукрам ...

Польскі каталіцызм проці „масонаў".

На каталіцкім зьезьдзе ў Пазнані „першы саноўнік" (прымас) каталіцкай царквы ў Польшчы сказаў вельмі цікаўную з палітычнага боку прамову. Павадыр „ваяўнічага каталіцкага кліру" у Польшчы казаў аб „сучасным крызісе польскай душы", раўнуючы Польшчу з жыдоўскім народам за часоў прарока Ісаі, калі той „быў пад ярмом тыраніі фальшу ды насіў „узду блуду" у вуснах сваіх... Паўтараючы словы Папы Пія II, ён сцьвярдзіў, што „ў нашых часох новы тыран лгарства паняволіў каталіцкі народ уздой фальшу". Хто-ж гэты тыран? „Гэты тыран — той напрамак мысьлі, які Папа назваў „панаваньнем сьвецкай думкі" („ляіцызмам" „ляік" значыць — міранін, сьвецкі чалавек. у процілежнасьці да „клірыка" — ксяндза)...

Гэты „ляіцызм" адмаўляе каталіцкаму касьцёлу, казаў прымас, — „улады навучаньня праўды, ды ўстанаўленьня праў упраўленьня народамі — у мэтах іх значнага збаўленьня"... Гэты „ляіцызм" раўнуе каталіцкую рэлігію... з усімі іншымі „рэлігійнымі фальшамі"... Гэткім чынам адчыняецца шлях да атэізму, камунізму і г. д... „Польская душа цяпер мучыцца сумлівамі ды няпэўнасьцю"... „Але Польшча павінна супрацівіцца рухам, якія падкапываюць яе рэлігійнае жыцьцё"... На барацьбу проці гэтых усіх „апосталаў фальшу" і заклікае прымас...

А перадусім Полшча павінна вясьці барацьбу — з „масонствам"... Як ведама, уся „народовая" прэса ў Польшчы называе марш. Пілсудскага з яго урадам і прыхільнікамі — „масонамі", ці — „жыда-масонамі"... Дык гэтай сваей прамовай галава каталіцкага касьцёлу у Польшчы—або абʼяўляе Пілсудскаму вайну, або — наадварот; прапануе яму—саюз, але — на варунках узмацаваньня каталіцкага клерыкалізму у Польшчы...

Як ведама, Напалеон пачуў сваю ўладу запраўды змацаванай толькі пасьля „канкардату" (угоды) з Рымам... А кожны ведае, што гэты „Рым" у Польшчы — значна сільнейшы, чым у тадышняй пасьля рэвалюцыйнай Францыі... Мусоліні таксама першым чынам пасьля перамогі над італьянскм народам зрабіў умову з Папай... А ведама-ж, што і гэты „другі Рым" таксама мае вялікую павагу сярод „кіруючых кругоў" сучаснай Польшчы.

Спыненьне справы ген. Мальчэвскага.

Справа былага ваеннага міністра ўраду Вітаса, ген. Мальчэвскага, абвінавачанага ў абразе вышэйшага начальства (марш. Піл-

судскага), а таксама і сваіх падуладных — афіцэраў і жаўнераў — у часе „пераваротуʺ, урэшце „ўможонаʺ (спынена). Справа спынена пасьля экпэртызы псіхіятраў, якія прызналі ген Мальчэвскага „асобнікам у найвышэйшай меры нэрвова хворымʺ, а з прычыны гэтага—у часе перавароту—быўшым зусім „непачытальнымʺ (неадказным за свае ўчынкі!)... Эндэцкія газэты праз увесь час пісалі, што абвінавачаньняў проці генарала ніяк ня можна было—ані сфармулаваць, ані даказаць... Дзе праўда, хто-ж разьбярэ?!

Хто забіў „атаманаʺ Оскілку?

Украінская газэта „Свабодаʺ, выдаваная ў Амэрыцы, дае цікаўныя інфармацыі аб тым, хто і за што забіў „атаманаʺ Оскілку. Газэта піша, што „атаманʺ лятуцеў аб тым, каб, пры польскай дапамозе, зрабіцца „гэтманам Польскай Украіныʺ. „Оскілка згінуў ад рукі ўкраінца, як здраднік нашага народуʺ.

Газэта далей кажа, што побач з Оскілкай аднача сна дабіваліся „гэтманскага тронуʺ пад Польшчай яшчэ некалькі востра канкураваўшых адзін з адным „кандыдатаўʺ... Дык няведама ўсё-ж такі, хто-ж забіў Оскілка?!—Мажа падаслаў забойцаў хто з яго канкурэнтаў?..

Сьмелы напад бандытаў.

На паштовае аддзяленьне на вагзале ў Самборы (Галічына) зрабілі напад некалькі азброеных бандытаў, якія зьвязалі ўсіх урадоўцаў, захапілі 11.000 злотых, дый зьніклі бясcьледна.

Заграніцай.

Зацьверджаньне Літоўскім Соймам трактату з ССРР.

5 лістапада Літоўскі Сойм—большасьцю 45 галасоў проці 24 — зацьвярдзіў трактат з Радамі, які паміж іншым, прызнае за Літвой Віленшчыну. Цікаўна, што дакладчык камісі Сойму проста заявіў, што Трактат з Радамі—вынік пераходу ўлады ў Польшчы ў рукі марш. Пілсудскага, што змусіла Літву да больш актыўнай палітыкі.

Правакацыйная праца італьянскай фашыстаўскай паліцыі ў Францыі.

Сьледзтва ў справе правакацыйнай працы фашыстаўскай паліцыі сярод італьянскай эміграцыі ў Францыі вядзецца далей — пад асабістым кіраўніцтвам францускага міністра ўнутраных спраў. Француская прэса, у зьвязку з гэтым сьледзтвам, піша аб Мусоліні дый аб фашыстах гак, як ня пісала ў часе вайны аб немцах. Прэса кажа, што Гарыбальдзі (галава фашыстаўскіх правакатараў у Парыжу) беспасрэдна знасіўся з італьянскім міністрам паліцыі Фэдэрцоні, ад якога атрымаў — „на працуʺ—паўмільёна франкаў. Той „замаховецʺ, які кінуў у гэтым верасьні бомбу ў аўтамабіль Мусоліні, быў высланы з Францыі ў Італію—самім гэтым Гарыбальдзі. Пасьля — для такога ж „замахуʺ—быў вышуканы новы „антыфашыстʺ ў Францыі, але той чамусьці ў канцы адмовіўся. З другога боку, Гарыбальдзі быццам прызнаўся, што — ў змове з італьянскімі анархістамі ў Францыі — ён мaніўся ўзарваць у паветра адзін з найбольш слаўных сабораў у Парыжу (Норт Дамʺ). Маюць падазрэньне, што той-жа фашыстаўскі агент прымаў учасьце ў слаўнай крадзежы брыльянтаў у замку Шантыі, віноўнікі якой ня знойдзены дагэтуль. У зьвязку з усім гэтым—апошні законапраект Мусоліні — аб тасаваньні кары сьмерці проці антыфашыстаў—выклікае страшэннае абурэньне ў францускай прэсе, якая вельмі „яркаʺ яго выражае.

„Гішпанская працаʺ італьянскага правакатара.

Той-жа самы правакатар, які па загаду фашыстаўскай ахранкі арганізаваў „замахіʺ на Мусоліні, канчаўшыяся, ведама-ж, „цудоўным ацаленьнем самім Богам сьцеражонага Павадыраʺ (як казаў нядаўна ў сваей прамове—з даручэньня рымскага Папы — адзін з князёў касьцела ў Рыме), які вылаўліваў у Францыі проці - фашыстаўскіх эмігрантаў, каб заманіць іх—„варачацца дамоўʺ—ў рукі паліцыі,—той-жа самы правакатар Гарыбальдзі працаваў і сярод гішпанскіх рэвалюцыянэраў у Францыі.— Так сама—з даручэньня Мусоліні, які аднача сна хацеў дагадзіць гішпанскаму ўраду і... пасварыць яго з францускім! Ен-жа арганізаваў так-званае „каталёнскае паўстаньнеʺ, якое мелі падняць некалькі дзесткоў гішпанскіх патрыётаў-проціpывэрыстаў, прарваўшыся праз француска-гішпанскую граніцу, каб... — каб папасьці ў рукі ведаўшай усё гішпанскай паліцыі! Добра, што ў час даведалася аб усім і француская паліцыя, ды папярэдзіла „паўстаньнеʺ; за якое Гарыбальдзі меў атрымаць — ад гішпанскага міністра ўнутр. спраў — 400.000 лiраў (франкаў).

Тэрор у Італіі шалее.

У зьвязку з „замахамʺ на Мусоліні ў Італіі ня спыняецца тэрор фашыстаў. У працягу апошніх 2 дзён арыштавана больш 400 асоб—з розных партыяў і проціфашыстаўскіх арганізацыяў.

Ідэал „закона аб прэсеʺ.

Газэты паведамляюць, што ў новым законе аб рэпрэсіях проці антыфашыстаў пачэснае мейсца адведзена „праступленьням прэсыʺ...

Напрыклад, заграні чны карэспандэнт, які „распаўсюджывае па-за межамі краю непажаданыя „перакручаныяʺ весткі аб Італіі дый аб яе пекным урадзе, караецца 15 гадамі катаргі...

Урачыстае адчыненьне італьянскага парляманту.

9 лістапада адбылося „нябывала ўрачыстае адчыненьне парляментуʺ ў Рыме. Вялізарнай большасьцю 295 паслоў-фашыстаў проці 10 — пазбаўлены мандатаў усе паслы так-званай „авэнтынскай апазыцыіʺ. Пасьля таго тэй жа большасьцю прыняты сьпешнасьць урадавага законапраекту—аб шырокім тасаваньні кары сьмерці (падставы законапраекту пададзены намі ў папярэднім №).

Міністар Бэнэш ня можа прыехаць у Італію.

Чэхаславацкі міністар Бэнэш спытаўся ў італьянскага ўраду, ці можа ён прыехаць у Італію, як прыватная асоба. Урад адказаў, каб ляпей ня ехаў, бо ён ня можа ручацца за яго бясьпечнасьць...

Добрыя парадкі ды „супакаеньне ў краі фашызму!

Новы канфлікт Югаславіі з Італіяй.

У сталіцы Югаславіі на мітынгу ведамы павадыр харватаў Радіч сказаў прамову, у якой перасьцерагаў урад і народ Югаславіі перад пагрозай з боку імпэрыялізму фашыстаўскай Італіі. У Італіі, краі калісьці вольнай мысьлі, цяпер вярнуліся часы Нэрона ці Калігулы („слаўныяʺ сваім зьверствам імпэратары былага Рыму). Радіч заклікаў Югаславію зрабіць саюз з Баўгарыяй, каб разам вясьці барацьбу проці замахаў Мусоліні на Балканы... Радіч заклікаў Францыю—зьвярнуць увагу на небясьпеку ад італьянскіх замахаў на яе калёніі... Час ужо — палажыць канец імпэрыялізму Італіі на Сярод земным моры...

Італьянскі пасол у Югаславіі зараз-жа заявіў востры пратэст проці гэтай прамовы Радіча...

„Жалезны трактатʺ між Францыяй і Нямеччынай.

5 лістапада ў Бэрліне падпісаны дагавор між Нямеччынай і Францыяй—ў справе абмену прадуктамі жалезнай прамысловасьці.

„Ваенны саюз Францыі з Нямеччынайʺ...

Ведамы нямецкі прамысловец Рэхбэрг, які стала працуе над поўным збліжэньнем Францыі і Нямеччыны, ды рабіў спробы ў гэтым кірунку навет у часе вайны,—апрацаваў цяпер плян **француска нямецкага ваеннага саюзу**. Падставай гэткага саюзу павінна ў першы чарод быць злучэньне... францускай і нямецкай арміяў — пад адзіным Генаральным Штабам. Францыя мела-б армію лікам 500.000, Нямеччына—300.000. Бэльгія так сама далучылася-б да гэтага саюзу. Рэхбэрг піша, што гэткі ваенны саюз назаўсёды спыніў бы небясьпеку вайны між Францыяй і Нямеччынай.

Гэты артыкул нямецкага прамыслоўца зьявіўся ў францускай газэце „Avenirʺ („Будучынаʺ). Але аднача сна ў афіцыяльным органе нямецкіх нацыяналістаў надрукаваны гэткага-ж зьместу артыкул старшыні аднэй з наймагутнейшых арганізацыяў нямецкіх нацыяналістаў. Гэты артыкул так сама даводзіць, што вайна між Францыяй і Нямеччынай, двума найбольш культурнымі і прамысловымі дзяржавамі Эўропы, аканчальна-б зруйнавала ня толькі іх, але і ўсю Эўропу. Дык вывад адсюль—адзін: трэба зрабіць саюз, а перадусім—ваенны...

Нямецкая прэса страшэна ўсхвалявана гэтымі артыкуламі.

Кошты вугальнай забастоўкі ў Англіі.

У толькі што адчыненым парляманьце міністар гадлю заявіў, што забастоўка вуглякопаў каштавала краю каля 300 мільёнаў фунтаў (паўтара мільярда даляраў).

Перамога рэспублікі ў Грэцыі.

На толькі што закончаных выбарах у Грэцыі 65 працэнтаў усіх паданых галасоў атрымалі прыхільнікі рэспублікі. Свабода выбароў ахоўвалася навет—гарматамі, якія былі пастаўлены на гарах навакол сталіцы.

Парляманцкія выбары ў Амэрыканскіх Злучаных Штатаў.

У Амэрыцы 2 лістапада адбыліся агульныя выбары ў так-званую Палату Прадстаўнікоў, ці ў Сойм, і — аднача сна выбары цэлай траціны сяброў Сэнату. На гэтыя выбары ўскладалі вялікія надзеі — ня толькі ў Амэрыцы, але і ў зьвязанай цяпер з ёй „залатымі ланцугамі Эўропе.

Як ведама, у Амэрыцы даўно ўжо істнуе так-званая „ангельская сыстэма партыяўʺ, абапертая на тым, што краем па чарзе ўпраўляюць толькі дзьве вялікія, амаль ня роўнай сілы, партыі. Калі выбары аддалі ўладу аднэй, дык другая пераходзе ў апазыцыю, і — наадварот. Ад часу зваленьня прэзыдэнта кандыдата „дэмакратаўʺ Вільсона з яго палітыкай прыязнага ўмяшацельства ў справы Эўропы, у Амэрыцы пануе партыя „рэспубліканцаўʺ, якая першым сваім лёзунгам якраз ставіць неўмяшацельства ў Эўрапэйскія справы

Партыя рэспубліканцаў ішла на новыя выбары, маючы вялікія шансы — палітычныя і эканамічныя. Фінансава-гаспадарчая, мілітарная і палітычная вага і моц Амэрыкі за апошнія гады дайшла да такога стану, якога ня мела ніколі. Протэкцыйная палітыка прэзыдэнта Куліджа дала амэрыканцам вялікі дабрабыт; вываз з Амэрыкі расьце нячувана; падаткі ў краі зьменьшаны наагул на 20 працэнтаў, а толькі перад самымі выбарамі ўрад запрапанаваў далейшае вельмі значнае зьмяншэньне іх. Адно толькі, аб чым неяк забыліся паны „рэспубліканцыʺ, гэта—аб павышэньні дабрабыту вялікай арміі так-званых „фэрмэраўʺ — дробных і сярэдніх, па нашаму — амэрыканскага сялянства.

За тое амаль ня ўсё гэтая сялянства належыць да ворагаў „рэспубліканскай партыіʺ — да „дэмакратаўʺ.

„Рэспубліканцыʺ пайшлі на выбары з гучным лёзунгам: „Дабрабыт і Куліджʺ. Рэспубліканцы абяцалі і надалей ўстрымлівацца ад учасьцяў у справах палітычна зьнішчанай ды гаспадарча згалеўшай Эўропы; яны заявілі, што здолеюць спагнаць з яе ваеннае пазыкі—у мільярдах даляраў, якія яшчэ больш узбагацяць жыхараў краю — коштам Эўропы. Рэспубліканцы не прызнаюць лігі народаў, ані жадаюць навет „увязывацаʺ ў справы „гаагскай міжнароднай правасуднасьціʺ... Рэспубліканцы сулілі далей бараніць кішані сваіх прамыслоўцаў — высокімі протэкцыйнымі мэтамі.

Праграма „дэмакратаўʺ пярэчыць амаль ня кожнаму пункту праграмы „рэспубліканцаўʺ. Яны толькі ў справе абніжэньня падаткаў ідуць яшчэ далей, абяцуючы радыкальную рэформу усей сыстэмы падаткаў. Дэмакраты хочуць разьвязаць рашуча і сумленна справу ваенных даўгоў Эўропы, разумеючы, што, забіўшы — эўрапэйскія рынкі, лішне суровым спагонам даугоў, Амэрыка тым самым спыніць узрост свайго вывазу, сваей прамысловасьці. Дэмакраты таксама нездаволены сучаснай „Лігай народаўʺ, але жадалі якраз наадварот — бліжэй падыйсьці да эўрапэйскіх справаў,

Есьць і яшчэ дробныя розьніцы, але нас гэта цікавіць менш. Дый ужо з вышэй сказанага відаць, як страшэнна важна для Эўропы была б перамога дэмакратаў, —якую зьмену яна ўнясла-б у агульную палітыку Амэрыкі адносна да Эўропы...

Адбытыя выбары, аднак, ня мелі значэньня рашучай зьмены адносінаў у краі, але значна аслабілі сілу ўрадавай партыі, якая цяпер павінна будзе значна больш лічыцца з апазіцыяй, чым дагэтуль. Дагэтуль прэзыдэнт-рэспубліканец меў вялікую большасьць — на 65 галасоў у „Соймеʺ і на 12 галасоў у Сэнаце. Новыя выбары далі абедзьвюм партыям у Сэнаце амаль ня роўныя лічбы галасоў: па 48 сэнатараў (залічаючы да дэмакратаў яшчэ „радыкалаʺ Ля-Фолетта). Гэткім чынам, Сэнат будзе тым „замкомʺ, які

В. Грывіч.

Шляхам Грамады.

Нарыс

(Усе правы аўтар пакідае за сабою).

Начальнік пошты ў С....ʺбыў родам, як кажуць у Варшаве, „галілеушʺ; прозьвішча ён меў Няўмельскі. За благой памяці аўстрыяцкі часоў ён у адным забытым богам і людзьмі куточку Прыкарпацьця быў на пошце сторажам, замятаў падлогі, тапіў печкі, стаяў ля дзьвераэй і г. д. Служба гэта была не цяжкая і многа хто з простых сьмяротных (у гэтым Няўмельскі быў шчыра пераканаы) быў-ба здаволены сваім лёсам. Але Няўмельскі быў не з такіх. Яго душа рвалася вышэй. У сэрца яго, яшчэ з дзіцячых гадоў, закраўся лятунак: калісь і самому зрабіцца начальнікам пошты!

Але аўстрыяцкае начальства аценіць яго талентаў ня ўмела, і Няўмельскі, ня гледзячы на ўсё сваё стараньне, па службовай драбіне ўверх ня сунуўся—„ня было месцаʺ.

Аж раптам, о, усемагутны Божа, уваскрэсла Польшча. Цяпер і Няўмельскаму адчынілася шырокая дарога да зьдзейсьненьня найдаражэйшых ягоных лятуценьняў. На „Крэсахʺ было нявычарпанае мора месц розных начальнікаў. І тут адразу аценілі ўсе здольнасьці Няўмельскага, ды ён быў назначаны начальнікам пошты ў С...

Праўда, спачатку праца неяк ня клеілася—„не хапалаʺ кваліфікаваных памоцнікаў. Але пасьля, як „пан начальнікʺ прыняў к сабе на службу аднаго „крэсовага палякаʺ, Антановіча, быўшага ўрадоўца расейскай пошты, усё пайшло „як па масьлеʺ.

Цяпер Няўмельскі мог-бы ўжо і спакойна адпачыць пасьля такой вялікай арганізатарскай работы, падумаць аб старасьці, купіць дзесь там у Галіцыі сабе прыгожанькі дамок, ды кусочак грунту.

Але ці ж гэтыя беларусы дадуць каму адпачыць? Ці аценяць усю веліч і красу „культурыʺ, якую ім нёс п. Няўмельскі і ўсе іншыя „кваліфікаваныяʺ арганізатары?.. Дзе там! Пасыпаліся нараканьні аб недаходзе пісем, прапажы даляраў і пасылак. Хтось навет напісаў аб гэтым у беларускую газэту.

Гэтага ўжо п. Няўмельскі даравацъ ня мог і пастанавіў беларускія газэты нішчыць, як „бальшавіцкуюʺ літэратуру. Вынятак з гэтага прысуду рабіўся надта малы і рэдкі.

І ў гэту нядзелю Няўмельскі, атрымаўшы „Беларускую Справуʺ, кінуў яе пад стол, ды ўзяўся за „праверкуʺ амэрыканскіх пісем.

Была яшчэ толькі сёмая гадзіна раніцы, і чыноўнікаў, апрача дзяжурнага, яшчэ ня было. Быў, як гаворыцца, найлепшы час „дзеля працыʺ. Няўмельскі так ёй аддаўся, што навет не заўважыў, як праз дзьверы ўсунуся камандант тутэйшага пастарунку паліцыі Пацёркоўскі.

Даўней у Аўстрыі, дзе Пацёркоўскі таксама пачынаў сваю службовую кар'еру, начальства і яго „ня зусім правільнаʺ ацэнівала. Пацёркоўскі быў гэтым абражаны і чакаў якойсь зьмены, каб паказаць усю сваю здольнасьць.

Наастатку і для яго прыйшла гэтая чаканая пара: уваскросшая Польшча адчыніла Пацёркоўскаму шырокую дарогу.

Пацёркоўскі трыумфаваў. Вынікі яго працы былі неспадзяваныя. Досьць было зрабіцца якойсь справе, асабліва калі яна так ці іначай магла назвацца палітычнай, як Пацёркоўскі адразу-ж—у імгненьне вока, ня шукаючы і не даходзячы, проста „па нюхуʺ, арыштовываў „вінавайцаўʺ. І за шэсьць гадоў ніколі ня здарылася яшчэ выпадку, каб ён „памыліўсяʺ: у „бадальнымʺ пакоі заарыштаваны заўсёды прызнаваўся да віны, дый выдаваў „сваіх сяброўʺ.

І Пацёркоўскаму пасыпаліся пахвалы, награды. Пацёркоўскі прынімаў гэта спакойна, холадна, як зусім справядліва заслужаную рэч, якая ня робіць неспадзеўкі. Пад моцнай рукой Пацёркоўскага зьнікала і „бальшавіцкаяʺ атмасфэра і „бальшавіцка-нямецкаяʺ інтрыга — беларуская школа, беларускія газэты.

Так цягнулася да выбараў у Сойм у 1922 годзе. Беларусы, якія, як здавалася Пацёркоўскаму, былі зусім ужо зьнішчаны, раптам заварушыліся з такою сілаю, што навет спосабы Пацёркоўскага не маглі даць ім рады. Рух рос і шырыўся стыхійна, гвалтоўна. На мейсца аднаго заарыштаванага дзеяча станавілася дзесяць новых, яшчэ больш сьмелых, больш крэпкіх.

Забабонны Пацёркоўскі гатоў быў верыць, што беларускі народ — гэта сто галовая гідра, у якой на месцы аднэй адсечанай галавы вырастае дзесяць новых.

Начальства-ж глядзела на справу іначай. Яно ўва ўсім бачыла нястачу „цьвёрдай рукіʺ.

На пана Пацёркоўскага цяпер ужо пасыпаліся не пахвалы, а нараканьні. Здараліся навет і выгавары. Апошні з такіх выгавараў і быў прычынай таго, што Пацёркоўскі сягоньня так рана прыпёрся на пошту.

Сам лёс даваў Пацёркоўскаму магчымасьць пабачыць справу, якую часта гадамі ня могуць выкрыць найлепшыя тайнікі; але ён быў так рад, што знайшоў пана начальніка аднаго, што яшчэ не пераступіўшы парогу, пачаў яго вітаць.

— „А, пане начальніку, нарэшце ўсё-ж такі я пана знайшоў... Дзень добры пану!ʺ—гаварыў ён, зачыняючы за сабою дзьверы.

— „Дзень добры, дзень добрыʺ,—адказаваў яму неяк зьрытаваны Няўмельскі, у душы праклінаючы гэту візыту і спрытна хаваючы ў столік якісьці ліст.

— „Перапрашаю пана начальніка, што я прыхаджу да пана так ранаʺ,—гаварыў вітаючыся Пацёркоўскі, — „але бачыце, паночку, маю да пана пільную справуʺ.

— „Э, што там рана, гляньце, пане камандант, дзе ўжо сонца"!—адказаў яму весела Няўмельскі, дагадаўшыся па голасе, што камандант яго „рэвізііʺ ня бачыў. „Я заўсёды рад, калі пан камандант да мяне прыходзеʺ.

— „Вельмі рад, што пан так да мяне адносіцца. Але, бачыце, я сягоньня да пана з „загадамʺ.

— „З загадамʺ?! — спытаўся ўвесь у страху за сваю „цэнзуруʺ Няўмельскі.

— „Ну так, з загадам. Але хай пан начальнік яго ня пужаецца. Мае загады не страшныя, і пан іх лёгка можа-ж споўніцьʺ — адказаў Пацёркоўскі, садзючыся, навет без гаспадаравага запрашэньня, на крэсла.

— „Я ўсё гатоў для пана споўніць, што ўходзе ў мой службовы абавязак, што гэтаму майму службовану абавязку не працівіцца.

— „О, не, не, не працівіцца... Наадварот: гэта ўваходзе ў панскі службовы абавязакʺ. „Бачыце прыйшло распараджэньне з старостава, каб зьвярнуць пільную ўвагу на „Беларускую Справуʺ, гэтую камуністычную рэптылююʺ. І, падсунуўшыся бліжэй да Няўмельскага, Пацёркоўскі пачаў штось ціха яму шаптаць...

— „Перапрашаю пана, я пакуль-што ня помню, каб у нас было нейкае падобнае распараджэньне. Аб гэтым трэба будзе спытацца ў Антаковічаʺ,

— „У паноў тут можа і ня было, але ў нас ёсьцьʺ.

— „Э, вось яно што?! але-ж перапрашаю пана: тое, што ёсьць загадам у вас, ня ёсьць загадам для насʺ.

— „Як-та ня ёсьць загадам?..

— „А так, проста: нам мусіць загадаць наша начальстваʺ.

— „Ну дык я пана начальніка прашуʺ.

— „А, гэта зусім іншы артыкул... Трэба было адразу так гаварыць... Ну, дык добра, — а бутэлька будзе?..ʺ — гаварыў пэўным сябе голасам Няўмельскі.

— „Будзе, будзе... чаму ня быць бутэльцыʺ гаварыў камандант, з усей сілы трасучы руку Няўмельскага.

— „Дык цяпер я пану каманданту прызнаюся: я ўжо два гады нішчу гэтыя беларускія газэты, а асабліва тыя, што выдае Сялян.-Работ. Грамада. Паночку даражэнькі, няўжо пан думаў, што я дурны?! Ды гэта-ж немагчыма, каб гэтыя хамы, гэтыя мужыкі чыталі такія газэты!.. І што гэта робіць нашае начальства, дзе яго вочы?!. Гэта-ж проста немагчыма, гэта-ж здрада гаспадарства і толькі... Калі мужыкі гады з два начытаюцца такіх газэт, то пэўна-ж зачнуць дамагацца школы на гэтым паганым беларускім языку, ды каб гэты язык быў у ўрадах, тады нам адгэтуль трэба будзе ўцякаць.

— „Праўда ваша, пане начальніку, што тагды мы прапалі... Ды й ня толькі мы, урадоўцы, а і паны прападуць і асаднікі, бо-ж гэтыя гады хочуць забраць усю панскую і абшарніцкую зямлю, дый навет бяз выкупу, дарма паміж сабою падзяліцьʺ!..

І пацягнулася паміж прыяцелямі бясконцая гаворка, а бясконцы у сваім бегу час таксама бег усё ўпярод ды ўпярод. У вызначаны час прыйшлі на пошту ўрадоўцы, рассартавалі карэспандэнцыю, адчынілі шуфляды сталоў, шафы і праца пайшла поўным ходам. К ваконцам пачалі падхадзіць інтэрасанты, называлі свае мяйсцовасьці і адхадзілі — радасныя, калі штось атрымовывалі, смутныя, калі ўрадовец адказываў, што ім нічога няма.

(Працяг будзе).

будзе моцна замыкаць „законную самаволю“ прэзыдэнта — перадусім у справах замежнай палітыкі...

Але ў „Сойме“ дэмакраты атрымалі толькі 10 новых мандатаў. Гэткім чынам, нагул, „рэспубліканцы“ асталіся пры ўладзе, хоць сіла іх і незалежнасьць ад дэмакратаў значна зьменшылася.

Падчырківаюць яшчэ цікаўны вынік выбараў: на выбарах пацярпелі паражэньне цэлы рад відных кандыдатаў рэспубліканцаў, асабіста выстаўленых прэзыдэнтам Куліджам. А гэта тлумачаць, як пэрасьцярогу перад правалам апошняга на будучых прэзыдэнцкіх выбарах...

Ня споўніліся, як бачым, надзеі згалелай Эўропы на амэрыканскія выбары. Найбольш расчараваньня дазнае Францыя, якой урад быў навет адлажыў узнаўленьне пераговораў з Амэрыкай у справе даўгоў, спадзяючыся, што будзе вясьці іх ўжо з новым урадам—дэмакратаў...

З работніцкага руху.

Пэпэсы на „Крэсах“.

У Берасьці ў часе выбараў у Мястовую Раду пэпэсавец Уэмбло зажадаў на зборцы ад праф. саюзу чыгуначнікаў, каб яны галасавалі за сьпісак ППС, пагражаючы ў праціўным выпадку зачыніць праф. саюз. Большасьцю галасоў было пастаноўлена галасаваць за сьпісак Работніцкай Еднасьці. У адказ на гэта Уэмбло распусьціў выбарны прэзыдыум чыгуначнікаў і назначыў сваіх камісараў, да якіх сябры ня маюць жаднага даверыя. Ня гледзячы на колькіразовае дамаганьне з боку членаў саюзу агульнай зборкі і выбараў у раду, паны пэпэсы не згаджаюцца на гэта і сходу ня склікаюць.

Другой праявай пэпэсаўскага і бундаўскага „дэмакратызму“ ў Берасьці быў разгон Рады Праф. Саюзаў Берасьця праз Цэнтр. Камісію ў Варшаве без паказаньня якіх-колечы прычын.

Пратэст Праф. Саюзаў Берасьця.

Канфэрэнцыя Праф. Саюзаў у Берасьці, па выслуханьню рэфэратаў і дыскусіі ў справе роспуску Рады Праф. Саюзаў, сьцьвярджае:

Дзеяльнасьць большасьці Цэнтр. Камісіі Праф. Саюзаў недапушчальна, бо, замест таго, каб імкнуцца да арганізаваньня як найшырэйшых работніцкіх мас у праф. саюзы, каб зрабіць гэтыя праф. саюзы здольнымі да запраўднай барацьбы з буржуазіяй і капіталістамі, тактыка большасьці Цэн. Кам. Праф. Саюзаў зводзіцца да таго, каб разьбіць Праф. Саюзы, каб з праф. саюзаў зрабіць ня масавую арганізацыю працоўных, але якуюсь партыйную пэпэсаўска-бундаўскую арганізацыю. Довадам гэтага зьяўляецца масавае зачыняньне саюзаў і Рад саюзных па ўсей Польшчы, а таксама роспуск Рады Праф. Саюзаў у Берасьці.

Роспуск Рады Праф. Саюзаў у Берасьці, мы, работнікі, прадстаўнікі ўсіх Праф. Саюзаў Берасьця, уважаем за недапушчальны. Сьцьвярджаем, што роспуск Рады ёсьць удар для работнікаў Берасьця, што Цэнтр. Кам. Праф. Саюзаў замест таго, каб памагаць работнікам у барацьбе з буржуазіяй, становіцца на старане апошняй. Дзеля таго лічым, што роспуск Рады Праф. Саюзаў недапушчальны і дамагаемся ад Цэн. Кам. Праф. Саюзаў зараз жа скасаваць пастанову аб роспуску Рады Праф. Саюзаў м. Берасьця.

Старшыня: (—) **Радачынскі.**
Сэкрэтар: (—) **Дудзік.**

„Абаронцы“ працоўных.

Цэнтральная Камісія Праф. Саюзаў, апанаваная праз ППС, прыняла пастанову проціў цэнтралізацыі і аб'яднаньня барацьбы за заработную плату і супольныя для ўсей работніцкай клясы дамаганьні, як: звароту стратаў з прычыны нявыплачанага дадатку на дарагоўлю, утрыманьня 8 гадзіннага рабочага дня, англійскай суботы, водпускаў, касы хворых і г. д. Пратэсты лявіцы супраць гэтай згубнай для работніцкай клясы пастановы былі адкінуты.

Прасьледаваньне праф. руху.

Паліцэйскія рэпрэсіі проці праф. руху растуць, чым далей, тым болей. Гэтак нядаўна зачынены будаўляны праф. саюз, апячатана памешканьне дрэўнага саюзу і выкінуты з свайго памешканьня саюзы шкляны і капялюшнікаў у Варшаве.

„Дэмакраты“

У той час, як адміністрацыя перасьледуе і зачыняе праф. саюзы, пэпэсы і бундаўцы выкідаюць паасобных дзеячоў з праф. саюзаў за іх палітычныя перакананьні і зачыняюць цэлыя аддзелы. У праф. саюзе чыгуначнікаў даволі выступіць з крытыкай управы, каб быць выкінутым. З дрэўнага саюзу выкідаюць за кандыдатуру па сьпіску Блёку Лявіцы ў Касу Хворых. З падобных-жа прычын выкінуты панамі „дэмакратамі“ з Цэнтральнай Камісі цэлы праф. саюз хімікаў і арганізуецца новы разламовы саюз.

Міжнародавая салідарнасьць.

У Альбэртголі (ў Англіі) адбылася дэманстрацыя работніцкіх арганізацыяў з прычыны 9 угодак сацыяльнай рэвалюцыі ў СССР. Прамаўляў дэпутат Ленсбюры, які адзначыў, што рэвалюцыю гэту выклікала нежаданьне рабоча-сялянскіх мас вясьці далей імпэрыялістычную бойню. Калі работнікі адмовяцца забіваць адзін аднаго, дык капіталісты ня змогуць вясьці далей вайны. Сабраўшыяся аднагалосна прынялі рэзалюцыю, у якой жадаюць далейшага пасьпеху рабочым і сялянам СССР у іх будаўніцтве сацыялізму. Рэзалюцыя дамагаецца ад англійскага ўраду скліканьня англійска-радавай канфэрэнцыі дзеля ўлагоджаньня нявырашаных пытаньняў, адчыніла гандлёвы крэдыт для СССР і пашырыла закон аб падтрыманьні замежнага гандлю таксама і на зносіны з СССР.

З жыцьця „Грамады“.

Проці незаконных рэпрэсіяў.

Да ведама Цэнтральнага Сэкрэтарыяту даходзяць бесперастанныя скаргі на ўладу першае інстанцыі, якая ў асобах Павятовых Старастаў сыстэматычна забараняець сходы Гурткоў нашае легальнае арганізацыі — Сялянска-Работніцкае Грамады.

Забароны чыняцца ўсімі Старастамі, але асаблівым бічом для легальнае працы зьяўляюцца Старасты Маладэчанскі, Слонімскі, Дзісенскі, Пастаўскі, Навагрaдзкі і Пінскі. Паліцыя сочыць за кожным крокам Камітэтаў Гурткоў, піша даносы Староствам, а Староствы рассылаюць павесткі, вызываючы нашых Сяброў за 30—40 вёрст для „збаданьня“ ў справе нібы то „нелегальных“ сходаў.

Вышэй успамянутымі Староствамі ўжо пакараны шмат Сяброў Грамады найвышэйшымі карамі—ў адміністрацыйным парадку, прычым пакараных часта адразу-ж садзяць пад арышт на розныя срокі. Гэта адчулі ўсе Камітэты Гурткоў Грамады, Камітэты Павятовыя і даверaныя асобы Грамады.

Проці гэтых беспадстаўных рэпрэсіяў зараз-жа неабходна падняць пратэст. Усе, як адзін, у абарону сваіх правоў, загарантаваных нам Канстытуцыяй, Вэрсальскім і Рыжскім Трактатамі!

Мы павінны карыстацца сваімі правамі і дабівацца тых магчымасьцяў легальнае працы, якія маюць іншыя палітычныя партыі: Вызваленьне, ППС, Хіена і г. д.

Свабода слова, свабода сабраньняў, свабода друку, загарантаваныя кожнаму з польскіх грамадзян артыкуламі 105 і 108 Канстытуцыі, ня выкановываецца; для нашых-жа зямель выданы яшчэ асобныя правілы, як напрыклад Распараджэньне Ген. Камісара Усходніх Земляў з 25—V. 1919 году, якое ў значнай меры абмяжоўвае палітычныя правы працоўнага люду захадняе Беларусі. Адміністрацыйная Улада нашых земляў ня лічыцца, ня кажучы ўжо аб Канстытуцыі, навет і з гэтым Распараджэньнем Камісара Усходніх Земляў.

Проці кожнага гвалту над нашымі правамі павінны пратэставаць усе, хто церпіць ад іх, хто жадае лепшай будучыні!

Пратэсты проці незаконнае забароны сходаў крэсавымі ўладамі павінны быць зараз-жа напісаны Камітэтамі ўсіх Гурткоў.

Лісты з пратэстамі, напісаныя так, як хто зможа напісаць, павінны быць адрэсаваны на імя Маршалка Пілсудскага, як прэм'ера, а таксама на імя міністраў Унутраных Спраў і Справядлівасьці.—Пісаць трэба ў 2-х экзэмплярах, сабіраючы пад тэкстам пратэсту магчыма большую лічбу подпісаў усіх Сяброў і не Сяброў Грамады, мужчын і кабет.

Падпісаныя пратэсты ў абодвух экзэмплярах перасылаюцца ў Цэнтральны Сэкрэтарыят (*Wilno, ul. Wielka 30—9*).

Усе павінны падпісваць пратэсты!

Не грамадзіст той, хто не падпіша пратэсту ў абароне сваіх правоў!

Цэнтральны Сэкрэтарыят.

Агульны сход віленскіх арганізацыяў.

7-га лістапада с. г. адбыўся агульны сход сяброў віленскіх гурткоў Беларус. Сялян.-Работ. Грамады, на якім было прысутных каля 130 сяброў. Парадак дня быў наступны: 1) Выбары Агульна-Гарадзкога Камітэту, 2) Прыймо новых сяброў, 3) Бягучыя справы.

Да гэтага часу Віленскія гурткі знаходзіліся ў пэрыядзе арганізацыі, дзеля чаго ня было сталага агульна-мястовага К-ту, а быў тымчасовы, які і кіраваў усей справай. Галоўнаю мэтаю апошняга сходу і было ўкамплектаваць сталы Камітэт, які і быў выбраны ў наступным складзе: Старшыня—Ф. Акіньчыц, Сэкрэтар—М. Навакоўскі, Скарбнік — Майсеюк. Сябры: Старкін і Цімафееў (ад Новасьвецкага гуртка), Сьвятоха і Залескі (ад Сьніпішскага гуртка). Мэнке Лявон і Рыжэўскі (ад цэнтр.-гарадзкога).

Усе сябры Камітэту выбраны аднагалосна сходам, які пажадаў К-ту ўсьпешнае і прадукцыйнае працы, не азіраючыся на змяінае сіпеньбуржуазна-абшарніцкае клікі і яе прэсы.

Між іншым, агульны сход пастанавіў прасіць Галоўную Управу Т-ва Белар. Школы распачаць чытаньне лекцыяў у Віленскіх Народных Дамох, сябры якіх вельмі адчуваюць патрэбу ў культурна-асьветнай працы.

На заканчэньне сходу, які прайшоў пры вялікім зацікаўленьні сабраўшыхся, была вынесена пастанова аб тым, каб паслаць прывітаньне паслу Барану, які сядзіць у Горадзенскім вастрозе за агульна-грамадзкія справы.

Прапяяўшы беларускі гімн, сабраўшыяся разыйшліся, цьвёрда веручы ў тое, што лепшыя для работніка і селяніна дні не за гарамі,

У гуртках.

✕ Даведаўшыся, што ў в. Радагошча, Райчанскай гм., Навагрaдзкага пав., арганізаваўся гурток „Грамады“,—камандант Райчанскага пастарунку прыйшоў да сэкрэтара гуртка Уладз. Флейты і трэбаваў выдачы арганізатара гуртка, ліку сяброў і пратаколу сходу, але грам. Флейта адказаў, што камандант ня мае права трэбаваць гэтага.

✕ Камандант Вяліка-Сельскага пастарунку Котранскай гм., Пружанскага пав., сачыць за „Грамадой“. Даведаўшыся ад вырадкаў — Ів. Місюлі, Р. Шчурка і В. Тарасевіча з в. Радзецк, што там сяляне запісваюцца ў „Грамаду“, прышоў ды страшыў гэтых грамадзістаў і „радзіў“ выйсьці з „Грамады“. А пасьля арганізацыйнага сходу грамадзістаў у в. Радзецк, гэты камандант кожнага сябру гуртка „бадал“ і пісаў пратакол. Ён-жа затрымлівае і не аддае сялянам „Народнае Справы“, за якую сяляне плацяць свой крывавы грош.

Ад Ц. Сэкрэт. Аб забіраньні газэт зьбярыце дадзеныя і прышліце ў Соймавы Клюб Беларус. Рялян.-Работ. Грамады.

✕ 5./X. г. г. паліцыянт № 1100 з Пескаўскага пастарунку прыйшоў у в. Ліхінічы, Пескаўскай гм., Ваўкавыскага пав., у госьці да солтыса Рыгора Кушмара—і пачаў страшыць жанок, што напіша пратакол за сушэньне лёну на пячы. Пасьля змусіў (на што ня меў права) селяніна Сяргея Казака вязьці яго да хаты. Па дарозе гэты № 1100 кажа: „Пся крэв, бялорусе, мы вас научымы, як запісываць сень в „Громадэн“! І фактычна пачалі „вучыць“: на Пакровы прыехаў да Ліханічаў камандант і напісаў пратакол на старшыню тамашняга гуртка і сяброў яго — быццам—за „нелегальнэ зэбране“. А гэтае „зэбране“ адбылося, выканаўшы ўсе фармальнасьці.

✕ 10 га кастрычніка г. г. адбыўся сход гуртка „Грамады“ ў в. Тулятын, Ставецкай гм., Пінскага пав., Староста на сход прыслаў каманданта паліцыі і двох паліцыянтаў з Ставецкага пастарунку. На сходзе сябры „Грамады“ гаварылі аб палажэньні беларускага народу пад Польшчай, аб беларускай школе, аб пaдатках, ППС, зямельнай рэформе і г. п. Не спадабалася гэта каманданту, і ён „розьвёнзал зэбране“. Прысутныя сябры ў ліку 23 асоб разыйшліся, ня вынесшы ніякай рэзалюцыі.

✕ Як стварыўся гурток „Грамады“ ў в. Вароніцы, Ёзкай гм., Браслаўскага пав., дык пастарунак у Ёдах зусім абезгаловеў: чэпіцца да сялян за нішто. Асабліва ўядаецца ён у косьці старшыні гуртка Трахіму Цялежнікаву. 22-га кастрычніка напісалі паліцыянты на яго аж два пратаколы: за дзірачку ў коміне і за тое, што сабака ляжаў у сенях ня прывязаны.

✕ Заложаны ў в. Галявічы, Пачапаўскай гм., Навагрaдзкага пав., гурток „Грамады“ зрабіў паліцыянтаў і шпікоў частымі „гасьцьмі“ гэтай вёскі. Але сяляне, як адзін, сталі тварам да „Грамады“ і задам да гэтых „госьцяў“ — навет старыя жанчыны паўпісываліся ў „Грамаду“. Толькі Мікалай Яўлаш і Антось Гаўрон ня толькі не аграмадзіліся, але навет і другіх запужваюць. Што праўда, яны ў ваччу сялян, як кажуць расейцы, маюць: „ноль внимания і грош презрения“.

✕ Поп Кутылоўскі з м. Казлоўшчына, Слонімскага пав., вядзе акцыю проці „Грамады“, называючы яе камуністычнаю, і распаўсюджвае Павлюкевічаўскае дэфэнзыўнае „Слова“ і адозву. Папу ў яго нягоднай рабоце памагаюць Андрэй Альшэўскі і Туровіч.

✕ Як толькі даведалася Дзісьненская паліцыя, што ў в. Мікалаева, Дзісьненскага пав., залажылі сяляне гурток „Грамады“, дык хацела стэрарызаваць сялян. 20./X. г. г. камандант з трыма паліцыянтамі, узяўшы ў вайскогага асадніка Зыгмунта Жылінскага „апінію“ маральнасьці сялян, пайшоў у Мікалаева. „Збадал“ там старшыню, сэкрэтара і сяброў гуртка, сьпісаў на іх „пратакол“. Страшыла паліцыя і нагаварывала не запісвацца ў „Грамаду“, а вайсковыя асаднікі ёй падбрэхвалі; але сяляне ў адказ на гэта яшчэ дружней пасыпалі ў „Грамаду“.

Ад Цэнтральнага Сэкрэтарыяту.

Агарэвіцкаму гуртку: Друкі і партыйныя білеты пасланы Вам даўно.

Ялоўскаму гуртку: Каб зрабіць сход, неабходна трэба паведаміць Старасту павятовага.

Згублены партыйны білет, выданы на імя Янкі Ропіча за № 5598, уневажняецца. Новы білет выдаецца за № 48117.

✕ **Крэўскаму гуртку.** Мітынгі забаронены. Паслы прыехаць ня могуць.

✕ Партыйны білет № 694, выданы на імя Мікалая Чыжа, уневажняецца.

✕ Уневажняюцца пасьведчаньні, выданыя, як старшыні гуртка, Сьцяпану Палейка № 4271, і, як сэкрэтару, Мікалаю Чыжу № 4272.

Да сяброў Грамады Вялейскага павету.

Ня гледзячы на тое, што ўжо двойчы былі разасланы па ўсіх гуртках пісьмы і формы сьпіскаў сяброў, па якіх яны павінны былі прысылаць сьпіскі на 1-га кастрычніка, некаторыя гурткі і дагэтуль яшчэ ня прыслалі ні сьпіскаў, ні сяброўскіх складак, ні справаздачы аб працы гуртка.

Апіраючыся на вышэйпаданае, Павятовы Камітэт просіць усе гурткі аднясьціся да справаздаўчае працы з поўнай увагай, бо ад гэтага будзе залежыць нармальнасьць працы, пачынаючы ад Гурткоў і канчаючы Цэнтральным Сэкрэтарыятам.

За ўсімі спраўкамі зьвяртацца толькі да Павятовага Камітэту.

Пратаколы сходаў, як новастворaных гурткоў, так і істнуючых ужо, павінны прысылаць толькі ў Павятовы Камітэт.

Запоўненыя дэклярацыі павінны адсылацца ў Цэнтральны Сэкрэтарыят, калі гурткі далёкія, а блізкія могуць прыносіць у Камітэт.

Кожны гурток павінен на дзень 1-га кожнага месяца прысылаць у Павятовы Камітэт справаздачу. Адпаведная анкета справаздачы будзе прыслана кожнаму гуртку.

Вялейскі Павятовы Камітэт
Бел Сял.-Раб. Грамады.

8 га лістапада 1926 г.
г. Вялейка.

Павятовы Зьезд.

У нядзелю, 21-га лістапада, а 10 гадзіне раніцай у „Domu Urzędniczym“, у Саколцы адбудзецца Зьезд Сяброў Сакольскага павету.

На зьездзе нeбходна прысутнасьць Камітэтаў Гурткоў, даверaных асоб Грамады ўсіх Сяброў Сакольскага павету.

Цэнтральны Сэкрэтарыят.

ХРОНІКА.

Агульны сход сяброў Новасьвецкага Гуртка Т-ва Беларускае Школы. 10 лістапада с. г. адбыўся ў Новасьвецкім Народ. Доме агульны сход сябраў Новасьвецкага Гуртка Т-ва Бел. Школы, на якім было прысутных каля 70 сяброў.

Гэты сход чамусьці вызваў вялікае зацікаўленьне паліцэйскае ўлады: прысутнымі былі: прадстаўнік ад Камісарыяту Ураду і паліцыянт, які вельмі шчыра стараўся даведацца „акольным шляхам“ адрасы Старшыні Нар. Дому У. Рэшатава і Старшыні Віленскага К-ту Бел. Сял.-Раб. Гр. Ф. Акіньчыца, хаця яны напэўна добра ведамы ў адрасным сталe, а можа і ў іншых установах. Пад канец сходу зьявіўся аж сам падкамісар з пшадоўнікам і атрадам паліцыі, які акружыў Нар. Дом. Сама сабою, нічога з таго, што можа хацелася-бы знайсьці, — не знайшлі: сход быў легальны і абгаварваў чыста арганізацыйныя пытаньні. Усіх прысутных зьдзівіла такая „ўважлівасьць“ паліцыі да мірнае культурнае працы беларускіх працоўных мас і ў-ва ўсіх зьявілася думка, што напэўна буржуазныя клюбы, гдзе ідзе п'янства і карцёжная ігра, не карыстаюцца такою „апекаю“ з боку ўлады...

Як бы там ні было, сход адбыўся без перашкод. Абгаварылі ўсе бягучыя па Нар. Дому справы: ўзнос сяброўскіх складак, пашырэньне бібліатэкі і г. д. Зроблена пастанова прасіць беларускую віленскую інтэлігенцыю прыйсьці на помач працоўнаму люду і падзяліцца з ім сваей навуковай ведай.

Па скончэньні сходу засьпявалі беларускі гімн і іншыя беларускія песьні, пасьля чаго мірна разыйшліся па хатах.

Чародныя публічныя лекцыі. У нядзелю, у 4 гадз. папал., у памяшчэньні „Грамады“ (Вялікая вул. 30 кв. 9) будуць прачытаны дзьве публічныя лекцыі. Ів. Савіцкага — уступленьне да гісторыі Беларусі і Грыневіча — „сацыяльная эволюцыя на фоне сусьветнае гісторыі“. Уваход бясплатны.

Скарбонкі Т-ва Беларускае Школы. Міністэрства Унутраных Спраў дало дазвол сябром Т-ва вывесіць у сваіх прыватных кватэрах скарбонкі дзеля збору ахвяр на мэты Таварыства.

„Дрыгва“ на сцэне. 13.XI г.г. у суботу у залі Віленскае Беларускае Гімназіі будзе згуляна „Дрыгва“ драма Фр. Аляхновіча.

Спэктакль адбудзецца з удзелам і пад кіраўніцтвам самога аўтара — на карысьць незаможных вучняў.

Пачатак у 7 гадз. увечары.

Афіцыяльны курс грошы на 12-га лістапада. Даляр — 8 зл. 95 гр. Залаты рубель — 4 зл. 61 гр.

12. XI. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,98. Зал. руб. 4,70 Чырвонец 47-50.

З жыцьця Горадні.

✕ **З жыцьця хімічнікаў.** Работнікі і работніцы нашага места, падобна работнікам другіх гарадоў польскае „дэмакратычнае“ рэспублікі, жывуць у вельмі цяжкіх матэрыяльных варунках, ня лепшых, чым варункі сялянскага жыцьця. Каб ня быць галаслоўным, падам тутака жменю фактаў, якія будуць казаць самы за сябе. Есьць у нашым горадзе **серніковая фабрыка**, якая працавала раней цэлы тыдзень (6 дзён), але няведама з якіх прычынаў раптам пачала працаваць толькі 5 дзён (мо' ў хуткім часе і таго ня будзе!). Зарабляюць тамака марныя грошы,—як кажуць, на хлеб дый ваду. Бо, напрыклад, кабеты зарабляюць па **10 злотых у тыдзень**,—дык чым можна, апрача хлеба дый вады, заспакоіць свой голад? А тут настае зіма, трэба адзецца, абуцца, напаліць у хаце і г. д. Трэба грошы і грошы... А ўсё з кожным днём даражэець, цэны на хлеб скачуць уверх. Дык вось, хочучы палепшыць матэрыяльныя варункі працы, работнікі гэтае фабрыкі, зарганізаваныя ў прафэсіянальны саюз хімічнікаў, на агульным сходзе зрабілі пастанову дэлегаваць свайго прадстаўніка да капіталіста швэда Анэнбэрга ў Варшаву з просьбаю і трэбаваньнем падвышкі платы і каб можна было рабіць 6 дзён у тыдзень. Той іх прыняў і навет абяцаў, што гэта неяк „da się zrobić“. Пры гэтым фабрыкант нагляднa паказаў работніцкім прадстаўнікам, як ён іх цэніць і за каго маець. Завёўшы ў кухню, ён паказаў свайго сабаку, які яму каштуе

шмат грошай, кажучы, што сабака кожын дзень зьядаець цэлага печанага гуся, сыру 1 фунт і, паеўшы, запівае гэта літрам малака...

Далегаты, пагледзеўшы, толькі сумна пераглянуліся. Прыехаўшы ў Горадню, яны сазвалі сход, расказалі, што бачылі ў свайго „хлебадаўцы" і што той абяцаў, ды што сам прыедзе за пару дзён...

Праходзіць пара дзён. Бачаць: едзе з сабакай у аўтамабілі Анзбэрг. Прыехаўшы, нічога не палепшыў і ніякага загаду не зрабіў дзеля палепшэньня быту работнікаў, толькі яшчэ раз наглядна паказаў усім, што яго сабака зьядае кілё сыру, печанага гуся і запівае літрам малака... Дык зразумелі работнікі, што яму даражэй гэны сабака, чым жыцьцё беларускага работніка і работніцы.

Молат.

Карэспандэнцыі.

Культурная праца.

(Вялейшчына).

Пасьля трох-месячнае маўчанкі, Вялейскі Беларускі драм-гурток пад кіраўніцтвам артыста Аляксандры Каляды, ізноў пачаў працаваць.

24-га кастрычніка г. г. у в. Новыя-Зімоды адыграны былі п'есы: „Пан Міністар" у 3 х актах Ф. Аляхновіча, і „Зьбянтэжаны Саўка" водзвіль у 1-м акце Родзевіча.

Ня гледзячы на тое, што пагода была надта дрэнная, народу сабралася шмат. Усе не маглі зьмясьціцца. Стаялі ў сенях.

Хата досыць вялікая, чалавек 150 зьмесьціць, запакоўленьне агульнае. Гэта сьведчыць, што і вёска цікавіцца тэатрам у сваёй роднай мове.

Гледзельнікі трымаліся падчас ігры надта добра. Воплескам ня было канца. Адчувалася, што яны былі шчырыя.

Артысты ігралі досыць добра, калі прыняць пад увагу яшчэ тое, што гэта першае іх выступленьне.

Стараньнем Нова-Зімодраўскага гуртка збудавана, хоць маленькая, але досыць добрая сцэна.

Апрача пастаноўкі спэктакляў, Управа Гуртка Т-ва Белар. Школы мавіцца павясьці больш шырокую працу ў гэтым напрамку. Хоча пераўтварыць сваіх аматараў у запраўдных мастакоў. Грам. Каляда мавіцца чытаць лекцыі па гісторыі тэатру, аб грыме, дыкцыі, дэклямацыі, фанэтыцы і т. п. Наскольлі гэта ўдасца — пакажа будучыня. Усё будзе залежаць ад слухачоў майстроўні.

Управа Гуртка Т-ва Бел. Школы.

Знайшлі „нелегальнае"!

(В. Ярашова, Маўчадзкае гм. Баранавіц. пав.)

Першае напуўліннае сабраньне сяброў Ярашоўскага Гуртка. Бел. Сял.-Раб. Грамады, аб якім за 6 дзён быў паведамлены Старэста Баранавіцкага пав., адбылася 19.IX б.г. Здаецца, давол часу мела староства даць перад сабраньнем той або іншы адказ на паведамленьне Старшыні Гуртка, Кастуся Галубовіча; але аказалася, што мясцовая паліцыя аб сабраньні нічога ня ведала, а старшыня ня ведаў, што пан Староста прыпішэ яму ажно 25.IX б.г. забарону з тэй прычыны, што паступіў ён „nie zgodnie z art. 3 Rozp. Kom. Z. W. z dn. 25.V 1919 r." і не напісаў у паведамленьні мэты, праграмы сабраньня і ў якой мове будуць адбывацца прамовы, адным словам, усяго таго, што вымагаецца ад арганізатараў публічных сходаў. Адначасна з атрыманьнем забароны пасыпаліся ў пастарунак даносы, што на сход было 150 пастаронных асоб, учасьнікі лаялі ўладу і іншая брахня.

Хто-ж гэтыя ворагі, якія робяць ілжывыя даносы, каб паказаць у працы Гуртка што небудзь „нелегальнае"?

Першы — гэта ўсім ведамы ў нас сышчык і правакатар, Ілья Журка, які ў леташнім годзе ўкраў у беднага селян. в. Ярашова, Цімоха Саўчука, авечку, зарэзаў і зьеў яе, а ў грам. Абрама Бушэля, каторы часова пражываў у в. Ярашове, — украў апошнюю карову. У 1925 г. за „нелегальную" працу пасадзілі ў вастрог 12 навінных сялян, якіх хутка выпусцілі на свабоду. Другі — знахар Антон Пэраход, ведамы ў нашай ваколіцы, ашуканец і п'яніца. Сяляне в. Ярашова пісалі на яго жалабу да Старасты Баранавіцкага пав. за тое, што, „лечачы" шаптаньнем розныя хваробы, ён ашуквае несьвядомых людзей і распаўсюджвае часта заразу. Адная за гэта ён дагэтуль не пакараны, так што свабодна „лечыць", п'е і гуляе... Апрача гэтых двух, займаюцца даносамі жыхары тэй-жа вёскі Сямён Шэпна — зяць абшарніка і Палая Віннічэк—кабета цёмная бедная. Ходзіць яна ў лапцях, пад носам мае заўсёды соплі, якія зьлізвае языком, — а вось на пастарунку часта бывае з даносамі!...

Маючы паказаньні ўсіх гэтых „сьведкаў" і забарону Старасты ў справе „нелегальнага" сабраньня, — 25.IX б.г. зьявіўся ў в. Ярашова Камандант пастар. дзярж. паліцыі ў м. Моўчадзі і напісаў пратаколы на Старшыню Гуртка К. Галубовіча і грам. А. Камара, у доме якога адбылася сабраньне. Паміж іншым, Камандант рупіўся даведацца, што ўдзельнікі гэтае сабраньне будуць пасаджаны ў вастрог. Вось, як стараюцца ў нас разьбіць шляхотную працу сьвядомых сыноў беларускага народу. Але — ці ўдасца?

Ярашовіч.

„Выбрыкі панскіх прыслужнікаў".

(З Дзісеншчыны).

Чаго толькі ня робіцца, каб перашкодзіць росту Грамады! Усе, каму Яна не да

Голас сялянства.

Пастанова.

Мы, грамадзяне м. Высоцка, Сталінскага пав., Палескага ваяводзтва аднагалосна дамагаемся спагнаньня з абшарнікаў 740 мільёнаў злотых „залеглых" падаткаў і скасаваньня 10% падвышкі падаткаў для сялянства, дамагаючыся перала жэньня іх на абшарнікаў.

М. Высоцк. **85 подпісаў.**

Пастанова.

Мы, грамадзяне сяла Залатое, Высоцкай гм., Сталінскага пав., аднагалосна дамагаемся спагнаньня з абшарнікаў 740 мільёнаў злотых „залеглых" падаткаў і скасаваньня 10% падвышкі падатку для сялян, дамагаючыся пералажэньня іх на абшарнікаў.

Залатое. 19 жніўня 1926 г. 14 подпісаў.

смаку, ня ведаюць, што ўжо і выдумліваць, бо бачаць, што на іхнюю брахню ніхто не зьвяртае і ўвагі.

Сьпярша страшылі. Гэтак у Празароцкай гміне гандляр шкаплерамі Юльян Самуйла пачаў страшыц, што ўсіх, хто запісаўся ў Грамаду, будуць вешаць. Але павесіць яшчэ ніводнага сябру не павесілі, а пана шкаплерніка сябры, за пагрозу, цягнуць да адказнасьці. Вось і годзі брахаць.

Тады пачалі высьмейваць усялкімі спосабамі і сяброў, і мову нашу, і газэты і г.д... Але на гэтае дык ніхто з нас і вухам не павёў. Брашы — хоць лопні.

Дык панскія падлізьнікі тады зрабілі штуку, якую толькі і могуц зрабіць „культурныя халуі, якія ад мужыка адарваліся, а да пана не даскочылі. Бо ўсё такі думаем, што паляк добрае мысьлі гэтага ня зробіць.

Гэтыя панскія рукалізы выбрудзілі ўначы 24.IX г.г. шыльд (вывеску) Празар. гміннага камітэту Грамады.

Хто гэтае зрабіў, — патроху даведаліся і пастараемся захаваць у памяці прозьвішча гэтага панскага падлізьніка.

Грамадовец.

Нам пішуць з вёскі што:

× У в. Апечках Стаўпецкай гм. і пав., на 40 вучняў прыслалі аж 3 вучцялёў і 1 вучыцельку. А вучыцялі гэтыя за тры гады навет і чытаць дзяцей не навучылі,—відаць, не дае карысьці школа ў чужой мове! Раз сабраліся сяляне і загаманілі, што-вось — у Слабодцы за Нёмнам беларускую школу твораць і спэктаклі беларускія там ставяць, — як там добра! Падслухаў гэта вучыцель—і на пастарунак. а там — паліцыя, пратакол і разагнала сялян. Прынясьлі раз абвестку, што ў Слабодцы будзе беларускі спэктакль — хто хоча, каб ішоў. — Угледзіў гэта паліцыянт Сьмяховскі,—агляну ўся, ці ніхто ня бачыць, сарваў прыклееную афішу і ў кішэнь. Цяпер сяляне шугнулі арганізавацца, каб палажыць канец гэткім адносінам.

× Прыслалі ў в. Кабыльнікі, Пачапаўскай гм., Наваградзк. пав., вучыцеля. Ня мае бацька ў-ва што абуць ці адзець сваё дзіця, каб паслаць у школу,—дык адразу пратакол! А сам вось што вычварае, — прыкладам, 24 кастрычніка г. г. усю ноч танцаваў у Кабыльніках (сам жыве ў в. Ятра), а назаўтра ў школу ня прыйшоў, бо—кажа: „здрове не позваля" (працаваць дзень і ноч). Гэткія ў нас настаўнікі!

Ад рэдакцыі. Аб гэтым падайце жалабу школьнаму інспэктару і напішэце дэклярацыі на беларускую школу.

× Паміж вёскаю Боўтрыкі, Тарнапольскай гм. і в. Буды, Ялоўскае гм., Ваўкавыскага пав. ляжыць 120 дзес. казённае зямлі з-пад высечанага лесу. У 1912 годзе расейскі ўрад рашыў прадаць гэтую зямлю па палове вёскам Боўтрыкі і Буды, сяляне далі задатак, і, каб не вайна, справа дайшла-б да канца. А цяпер зусім іначай. Сяляне вёскі Буды ня езьдзілі ў Расею, мелі за што купіць і купілі зямлю, а Боўтрыкі—езьдзілі і хоць зьбяднелі, але хацелі купіць, бо жыцьця няма бяз зямлі, ды—дзе ж там! Не прадалі. Боўтрыкі жаліліся ў Варшаву, але нічога не памагло.

Ад рэдакцыі. Гэтую справу мы перадалі ў Соймавы Клюб Бел. Сялян.-Раб. Грамады.

× Селянін Міхась Андруцэвіч з в. Пінчычы, Дзятлаўскай гм., Навградз. пав., узяў каргачку і паехаў па дровы, што зусім ужо згнілі ў лесе. Назьбіраў і едзе з людзьмі да хаты. Прыехаў ён да пасады Хільмоны, і спаткалі яго лясьнікі: Лазоўскі—з в Галаўлі і Вайтовіч з Польшчы. Аглядаючы дровы, Вайтовіч крычаў на сялян: „Большэвіцы, пся крэв,—бандыці"! А Лазоўскі так лаяўся, што і апісаць ня можна. Грам. Андруцэвіч адказаў, што ён не бандыт, а той бандыт, хто гэтак лаецца, ды запыняе людзей, — як яны. —Дык яны, памсьціўшыся за гэта, тры злоты садралі з Андруцэвіча за дровы, якія дыўно згнілі ў лесе, напісалі пратакол і забралі сякеру, ды, трасучы рэвольвэрамі, хацелі вярнуць яго за 6 вёрст да лясьнічага.

× Удава Ярына Магір з в. Кошлавічы, Дзевяткаўскай гм., Слонімскага пав., не заплаціла страхоўкі, бо сама бяз хлеба сядзіць. У Ярыны Магір жыве другая ўдава, Люба Весялуха, — жанчына без кала — без двара. Вось-жа войт з пісарам, зайшоўшы па падатак да Яр. Магір і заставшы ў хаце аднаго хлопчыка Весялухі, забралі з хаты самавар гэтай кватаранткі. Цяпер-жа жанчына падрала апошнія чаравікі, ходзячы па самавар, усё ткі не аддалі яго.

× Сахановіч, — сэквэстратар Нова-Пагостскай гм., Браслаўскага пав., душыць сялян пры спаганяньні падаткаў. — Чуць спазьніўся селянін, дык ён удвая спагоне. А-то і па два разы трэбуе падатак; — тады, хто мае квіт,—то шчасьце, а хто — не, то другі раз плаціць. Пры плацяжы падатку трэба з ім таргавацца, бо заўсёды трэбуе больш, чым належыць.

× 13 кастрычніка г. г. у часе выплаты грошаў за работу ў двары Кабаках, Малецкай гм., Пружанскага пав., дворскі войт „пан" Крупскі—былы балаховец. — за тое, што Мікалай Мароз з в. Хвойнікі ня схіліўся, як праходзіў гэты „пан",—схапіў хлапца за каўнер і, наклаўшы кулакоў у плечы, выкінуў на двор.—Гэтак панскія сабакі паступаюць з рабочымі!

× Тодар Ляховіч з в. Вялікае Сяло, памоцнік войта ў Гарадоцкай гм., Маладэчанскага пав., вельмі ўціскае сялян.—У Казла Пётры з в. Бярозаўцы за 5 зл. штрафу забраў новы кажух. 17/X г. г. гэты Ляховіч з гмінным пісарам Воўкавічам ў в. Васькоўцы пазабіралі апошнія кажухі, падушкі, бурносы і г. п. неабходныя рэчы. Да Міхася Невяровіча ў в. Бярозаўцы кідаліся з рэвольвэрам, каб ён йшоў адсядзець суткі вастрогу ў гміну.

× У вёсцы Стральцох, каля Баранавічаў, гаёвы пана Юндзіла фальшыва замэльдаваў сваму „хлебадаўцу", што вясковыя хлапцы пасуць коні ў лесе на яго пасьвішчы, хаця яны пасьвілі на сваім, грамадзкім. Дык „грабя" паклікаў паліцыю, якая пачала біць хлапцоў. Хлопцы, пакаштаваўшы пару добрых тумакоў, давай уцякаць. Камандант, убачыўшы, што „chłopi zwiewają", пачаў страляць у іх, ды палажыў трупам аднаго з хлапцоў на мейсцы. Да ніякай адказнасьці камандант не пацягнены.

× 24 кастрычніка г. г. на сход гуртка „Грамады" ў в. Міхалі, Пліскай гм., Дзісьненскага пав., усунуўся п'яны паліцыянт з Пліскага паст., Рагацкі, і пачаў чапляцца да старшыні гуртка з рознымі глупствамі. Калі зьвярнулі яму ўвагу, што трэба гутарыць пабеларуску, то злаяў ён беларускую мову. Ледзьве ўспакоілі яго.

× Уначы з 13 на 14 (па старому стылю) верасьня г. г. на слупах каля царквы, да якой належыць в. Парэчча, Слонімскага пав.,—было напісана: „Трэбуем звальненьня палітычных вязьняў і скасаваньня асадніцтва на „Крэсах", і вывешаны 2 чырвоныя сьцягі. Угледзіў гэта поп і загадаў зьняць сьцягі. Сабраўся народ і пасьля вутрані пачаў гаманіць аб сваёй нудзе-бядзе, аж прыйшлі два паліцыянты, з якіх адзін — асаднік з Мар'янполя, і, зьлаяўшы людзей, загадалі разыйсьціся—народ разыйшоўся, а самы пачалі зьдзіраць напісанае. Выйшаў поп і аддаў сьцягі паліцыі.

× Шчараўскі поп, што ўжо 5 чалавек упакаваў у вастрог, — за пахаваньне жонкі Сьцяпана Жука з в. Малай Волі, Курылаўскай гм., Слонімскага пав., трэбаваў 47 зл.

× У в. Дарагляны, Курылавіцкай гм., Слонімскага пав., памёр непрацаздольны Сяргей Шыманскі і пакінуў жонку бяз гроша. Удава ня мела за што прывязьці папа да хаты, дык без папа завязьлі нябожчыка ў Дзерачынскую царкву. А там поп бяз 9 зл. не згадзіўся адслужыць паніхіды. Тры дні стаяў пакойнік у царкве і толькі на чацьверты дзень згадзіўся поп за 3 зл. 25 гр. выпаўніць абрад.

× 10. X. г. г. у в. Стары Пагост у працягу паўгадзіны пагарэлі 25 гаспадароў, —пагарэла многа дабра і жывіны. 25 сямей засталіся бяз хлеба, вопраткі і страхі над галавою.

Змаганьне за родную школу.

Школьная Улада супроць волі люднасьці паадчыняла ўрадовыя польскія школы ў тых вёсках, дзе люднасьць дамагаецца сваей роднай беларускае школы. Што-год падаюцца просьбы на прыватныя беларускія школы, але Школьныя Інспэкторы не дазваляюць і прыватных школ.

У 1925 годзе масава складаліся дэклярацыі аб жаданьні ўрадовай беларускае школы, але таксама і ўрадовае беларускае школы яшчэ не даюць.

Ня гледзячы на колькі-разовыя адмовы з боку Школьнае Улады, люднасьць беларуская ўсё-ж такі ня траціць надзеі ды ізноў настойна дамагацца таго, што ей належыць.

Сёлета таксама шмат вёсак праз Т-ва Беларускае Школы дамагаюцца прыватнае школы ды масава складаюць дэклярацыі на ўрадавую беларускую школу.

Але Школьныя Інспэктары і Куратары вымагаюць столькі фармальнасьцяў, што выдача канцэсіі на прыватныя школы вельмі зацягваецца.

Папярэдняга жа дазволу на занятків таксама не даюць.

Выконываючы ўсе фармальнасьці, што вымагаюцца для адчыненьня прыватнае беларускае школы, людпасьць ня хоча пасылаць сваіх дзяцей у чужую польскую школу.

А Школьныя Інспэктары навет, часам, штрафуюць бацькоў, якія не пасылаюць дзяцей у польскую школу.

Гэтак, Школны Інспэктар Навагрудзкага павету у вёску Зарэчча, Карэліцкае гміны прыслаў 18 паведамленьняў аб аштрафаваньні бацькоў ад 1-го да 8 злотых або адсідкі ад 1-го да 4-х дзён.

Трэба аднаначыць, што просьбу аб выдачы канцэсіі на прыватную беларускую школу ў гэтай вёсцы Таварыства Беларускае Школы паслала ў верасьні м-цы г. г.

У вёску Руткевічы, Карэліцкае гміны, той самы Інспэктар прыслаў „33" паведамленьні аб такіх самых карах на бацькоў за непасыланьне дзяцей у польскую школу. Жыхары гэтае вёскі таксама дамагаюцца сваей роднай школы.

Школьны Інспэктар Вялейскага павету аштрафаваў на 10 злоты жыхароў в. Асіновічы, Вялейскае гміны за непасыланьне дзяцей у польскую школу. Просьбу аб выдачы канцэсіі на гэту школу Таварыства Беларускае Школы паслала аж у верасьні, але пакуль што жаднага адказу ад Інспэктара няма.

Галоўныя Управы Таварыства Беларускае Школы ў справе зацягваньня выдачы канцэсіі Школьнымі Інспэктарамі, а ў зьвязку з гэтым і ў справе штрафаў за непасыланьне дзяцей у польскую школу зьвяртаецца да Міністра Асьветы.

Да ведама сяброў і Гурткоў Таварыства Беларускае Школы Дзісьненскага і Наваградзкага паветаў.

Дзеля кіраваньня працаю Гурткоў Таварыства Беларускае Школы на мясцох Галоўная Управа Т-ва, на падставе арт. „4" §§ 15 і 16, ужо залажыла ў месьце Глыбокім на Дзісьненскі павет і ў м. Наваградку на Наваградзкі павет—Акружныя Управы, як адзелы Галоўнае Управы ў Вільні.

Акружныя Управы кіруюць справамі арганізацыі і легалізацыі Гурткоў і бібліятэк-чытальняў, прымаюць у Таварыства новых сяброў, якія яшчэ не надавалі заяваў у Галоўную Управу і не атрымалі сяброўскіх білетаў, высылаюць Статут і інструкцыі Т-ва, школьныя дэклярацыі і іншыя бланкі ў справе арганізацыі і легалізацыі Гурткоў, бібліатэк-чытальняў, народных дамоў, адчыненьня прыватных беларускіх школ і г. далей.

Толькі ў справе выдачы кніг для бібліатэк-чытальняў на льготных варунках (на выплату) трэба зьвяртацца да Галоўнае Управы праз сваю Акружную Управу.

Справы Гурткоў і сяброў Таварыства з Наваградзкага і Дзісьненскага паветаў Галоўная Управа перадае ў адпаведныя Акружныя Управы.

Так што ўжо залегалізаваныя і не залегалізаваныя Гурткі і тыя грамадзяне, якія пажадаюць быць сябрамі Таварыства, а так сама і тыя, каму патрэбны школьныя дэклярацыі і інструкцыі ў культурна асьветных справах ад 15 гэтага лістапада мусяць ужо зьвяртацца асабіста ці пісьменна да Наваградзкае Акружнае Управы па адрэсу: Nowogródek, Wielki rynek, 37, а да Глыбоцкае Акружнае Управы па адрэсу: M. Głębokie, ul. Warszawska—69.

Уся перапіска з Наваградзкага і Дзісьненскага паветаў, што будзе прыслана ў Галоўную Управу пасьля 15 гэтага лістапада, для выкананьня будзе адсылацца ў Акружныя Управы.

Усе пасьведчаньні і сяброўскія білеты, выданыя Галоўнаю Управаю, лічацца і на далей важнымі і могуць быць заменены толькі па распараджэньню Акружных Упраў.

Сяброўскія складкі ад гурткоў і сяброў Наваградзкага і Дзісьненскага паветаў так сама павінны скіроўвацца ў Акружныя Управы. **Галоўная Управа.**

11. XI. 1926 г.

Паштовая скрынка.

А. Кудраўцу. У Вашай карэспандэнцыі ня можна знайсьці сэнсу, а апроч таго, няма ў ёй адрэсу карэспандэнта. Таму і не зьмяшчаем яе.—**Цупрыяну.** Вашай карэспандэнцыі не зьмяшчаем з прычыны недакладнасьцяў у ёй і нястачы там Вашага адрасу. — **Асташонку і № 1840.** Вашых карэспандэнцыяў зьмясьціць ня можам.—**Селяніну.** Вы наракаеце, што Паўлюкевіч нахальна прысылае Вам свае дэфэнзыўнае „Белар. Слова". Ужо не пашле, бо перасталі паны даваць яму „авансік". — **Янцы Гутто.** Вашу карэспандэнцыю аб папу з дзяком не зьмяшчаем, бо папоўскімі справамі займаемся тады, калі яны крыўдзяць народ. **Беднаму селяніну.** Вы ў сваей карэспандэнцыі ясна не сказалі: ці ў дзень імянін свае „малжонкі" ваш вучыцель адправіў сваіх дзяцей са школы да хаты (аб чым толькі можна дагадвацца з папярэдняга зьместу),—ці не. Ад гэтага-ж залежыць уся „соль" карэспандэнцыі. — Бяз гэтага выясьненьня зьмясьціць яе ня можам. **Грам. Жуву.** Другая Вашая карэспандэнцыя не падходзіць у газэту па свайму зьместу. **В. Гэтаму—во.** Ваш фэльетон выкарыстаем. Пісаць можаце. — Пішэце больш. **Гобусу.** Аб „посьпехах" Шурпы мы ўжо пісалі.

Адказны Рэдактар: К. Вактовіч. Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22. Выдавец пасол на Сойм П. Мятла.